Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# За ленінскія кадры



ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

№ 16 (110) | 4 кастрычніка 1940 г. | Год выдання VI

## ЗА ДАЛЕЙШЫ ЎЗДЫМ КОМСАМОЛЬСКАЙ РАБОТЫ

Праведзеныя ў верасні справаздачна-перавыбарчыя комсамольскія сходы груп, курсаў і факультэтаў і універсітэцкая комсамольская канферэнцыя падверглі суровай большэвіцкай крытыцы работу комсамольскай арганізацыі і яе кіруючы актыў за недастатковую ўвагу ў справе няўхільнага правядзення ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, барацьбы за авангардную роль комсамольцаў у вучобе. Сходы наметцілі канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму ўздыму комсамольскай работы на аснове рашэнняў XI пленума ЦК ВЛКСМ.

У выніку перавыбараў да кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй прышоў повы малады актыў, поўны гарачага імкнення старанна працаваць у арганізацыі. Комсоргамі груп, сакратарамі факультэцкіх і комсамольскіх бюро ў большасці вылучаны маладыя комсамольцы. Так, сакратаром комсамольскага бюро геофака выбран сталінскі стыпендыят тав. Шэфер, які да гэтага часу працаваў старастай групы; сакратаром КСМ бюро хімфака выбрана выдатніца вучобы Сара Рубніч і т. д.

Маладыя актывісты з ахвотай прыступілі да разгортвання комсамольскай работы. Тав. Таўбін, комсорг 1 групы IV курса гістфака, адразу ж пасля перавыбарчага схода з удзелам комсамольцаў склаў дэтальны план работы комсамольскай групы. Гэтым планам прадугледжана правесці рад каштоўных мерапрыемстваў. Пачынаюць разгортваць сваю работу. праўда яшчэ марудна, асобныя комсамольскія бюро факультэтаў.

Аднак, яшчэ марудна перабудоўваецца работа комсамольскай арганізацыі ў свеце рашэнняў XI пленума ЦК ВЛКСМ. Не ўсе комсамольцы ўцягнуты, як гэтага патрабаваў XI пленум, у актыўнае комсамольскае жыццё, не маюць комсамольскіх даручэнняў. І цяпер у арганізацыі ёсць яшчэ нямала такіх комсамольцаў, якія прама ці ўкосна адарваны ад саюзнай работы.

Нельга не указаць на нездавальняючую работу комсамольскага камітэта з маладым актывам, упершыню прышоўшым да кіраўніцтва. З ім па сутнасці справы нічога яшчэ не праведзена, а работы па выхаванню гэтага актыва прадстаіць правесці надзвычайна многа. Трэба навучыць маладога комсамольскага работніка правільна размяркаваць абавязкі паміж комсамольцамі, наладзіць дзелавое социялістычнае спаборніцтва паміж комсамольцамі і студэнтамі.

Дэлегаты універсітэцкай комсамольскай канферэнцыі прапанавалі нова-выбранаму камітэту комсамола больш і глыбей унікаць у пытанні акадэмічнай работы комсамольцаў і несаюзнай моладзі, рашуча змагацца з лодырамі, верхаглядамі і дэзарганізатарамі працоўнай дысцыпліны; узмацніць абаронна-фізкультурную работу, дабіўшыся, каб кожны комсамолец авалодаў некалькімі ваеннымі спецыяльнасцямі.

Комсамольская група—пярвічная ячэйка арганізацыі. Тут па сутнасці і павінна праводзіцца ўся гэта работа. Таму на комсамольскую групу патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу.

Комсамольская і другія грамадскія арганізацыі факультэта ў гэтым годзе не звярнулі амаль ніякай увагі на студэнтаў першых курсаў. А сярод іх патрэбна было-б правесці вялікую работу. Трэба прывіць першакурснікам любоў і навыкі да ўпартай і настойлівай работы над сабой, умела прыабшчыць іх да вузаўскага жыцця.

*У Соўнаркоме СССР*

## Аб устанаўленні платнасці абучэння ў старшых класах сярэдніх школ і ў вышэйшых навучальных установах СССР і аб змяненні парадку назначэння стыпендый

Улічваючы ўзросшы ўзровень матэрыяльнага добрабыту працоўных і значныя расходы Совецкай дзяржавы на будаўніцтва, абсталяванне і ўтрыманне неперарыўна ўзрастаючай сеці сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, Совет Народных Камісараў СССР прызнаў неабходным ускласці частку расходаў па навучанню ў сярэдніх школах і вышэйшых навучальных установах СССР на самых працоўных і ў сувязі з гэтым пастанавіў:

1. Увесці з першага верасня 1940 года ў 8, 9 і 10 класах сярэдніх школ і вышэйшых навучальных установах плату за навучанне.

2. Устанавіць для навучаючыхся 8—10 класаў сярэдніх школ наступныя размеры платы за навучанне:

а) У школах Масквы і Ленінграда, а таксама сталічных гарадоў саюзных рэспублік—200 рублёў у год;

б) Ва ўсіх астатніх гарадах, а таксама ў сёлах—150 рублёў у год.

**Увага:** Указаную плату за навучанне ў 8—10 класах сярэдніх школ распаўсюдзіць на навучаючыхся тэхнікумаў, педагагічных вучылішч, сельскагаспадарчых і медыцынскіх школ і другіх спецыяльных сярэдніх навучальных устаноў.

3. Устанавіць наступныя размеры платы за навучанне ў вышэйшых навучальных установах СССР:

а) У вышэйшых навучальных установах, якія знаходзяцца ў Маскве, Ленінградзе і сталіцах саюзных рэспублік — 400 рублёў у год;

б) У вышэйшых навучальных установах, якія знаходзяцца ў другіх гарадах—300 рублёў у год;

в) У вышэйшых навучальных установах мастацкіх, тэатральных і музыкальных—500 рублёў у год.

Плата за навучанне ўносіцца ў адпаведныя навучальныя ўстановы роўнымі долямі два разы ў год: да 1 верасня і да 1 лютага.

**Увага:** За 1-е паўгоддзе 1940-41 вучэбнага года плата за навучанне ўносіцца не пазней 1-га лістапада г. г.

5. Плата за завочнае навучанне ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах узімаецца ў палавінным размеры.

6. Устанавіць, што з 1-га лістапада 1940 года стыпендыі назначаюцца толькі тым студэнтам і навучаючымся ў тэхнікумах, якія праяўляюць выдатныя поспехі.

(ТАСС).

## МАЛАДЫ АКТЫЎ ЗА РАБОТАЙ

На сваім справаздачна-выбарчым сходзе комсамольцы фізмата справядліва крытыкавалі работу комсамольскага бюро. Бюро ў сваёй практычнай рабоце вельмі мала і павярхоўна займалася пытаннем вучобы і дысцыпліны студэнтаў і ў першую чаргу комсамольцаў. Міма ўвагі бюро праходзілі факты грубага нарушэння вучэбнага працэса, не звярачвалася ўвага на лодыраў і прагульшчыкаў.

Больш 100 студэнтаў фізмата за непаспяховасць пераведзены на наступныя курсы ўмоўна. Некаторыя комсамольцы маюць па двух і нават больш прадметах нездавальняючыя адзнакі (Оркін, Левін, Гінзбург і др.). А студэнт-комсамолец Хурсік за два годы навучання ва універсітэце атрымаў толькі адну добрую адзнаку, за тое нездавальняючых—сем. Зараз ён выключан з універсітэта. Выключаны за непаспяховасць і комсамольцы Фрыдлянд і Іванова.

Не лепш абстаіць справа і з дысцыплінай. Не гледзячы на тое, што справаздачна-выбарчы комсамольскі сход заклікаў комсамольцаў змагацца за выкананне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, такія таварышы, як Андрук, ужо з першых дзён вучобы прапускаюць лекцыі без уважлівых прычын.

Выконваючы рашэнні XI пленума ЦК ВЛКСМ, наша комсамольская арганізацыя дабілася значных поспехаў у галіне разгортвання масава-абароннай работы сярод моладзі факультэта. Сумесна з профбюро ў нас арганізаваны абаронныя гурткі, якімі кіруюць самі студэнты. Нядрэнна разгортваюць сваю работу нова-арганізаваны фотагуртюк і гурток радыстаў.

Але гэта толькі першыя крокі ў нашай рабоце. Трэба спадзявацца, што прышоўшы малады комсамольскі актыў да кіраўніцтва факультэцкай і комсамольскай арганізацыі прыкладзе ўсе свае здольнасці і ўменне для таго, каб апраўдаць давер'е, аказанае яму комсамольцамі.

**І. АСІПКОЎ — сакратар комсамольскага бюро фізмата.**

## Прадуманы план

Па-баявому разгарнулася комсамольская работа ў першай групе IV курса гістфака, дзе комсоргам выбран т. Таўбін. На першым сходзе пасля перавыбараў комсамольская група абсудзіла план работы на першае паўгоддзе. План прадугледжвае правядзенне грамадскай і культурна-масавай работы. Так, напрыклад, на 2 кастрычніка назначан сход, прысвечаны III з'езду ВЛКСМ, на якім з дакладам выступіць тав. Пырх.

Вызначана арганізаваць вечар, на якім даклад аб расправе Александра II с Н. Г. Чарнышэўскім зробіць т. Бараноўская. Будзе праведзена таварыская дыскусія па «Неотосланным письмам». Тав. Міхайлоўскі падзеліцца сваімі ўражаннямі аб зробленай ім гэтым летам паездцы ў Крым.

План прадугледжвае таксама барацьбу за павышэнне паспяховасці ў групе. Для дапамогі адстаючым да іх прымацаваны выдатнікі і ўдарнікі вучобы, якія сістэматычна будуць дапамагаць ім у вучобе сваімі парадамі і ведамі.

Работа комсамольцаў гэтай групы можа служыць прыкладам для астатніх груп IV курса.

**АГЕЕНКА.**

## Работа комсамольскай групы разгортваецца

Комсоргам II курса філфака сход выбраў т. Антонаву. З першых-жа дзён сваёй работы т. Антонава праявіла сябе як здольны і энергічны арганізатар. Так, пры непасрэдным удзеле т. Антонавай арганізавана творчая літаратурная група. Група ўжо прыняла праграму работы і правяла адзін літаратурны вечар.

Зараз распачата работа па падрыхтоўцы да святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі і 35-гадовага юбілея паэта БССР Янкі Купала.

Аднак група КСМ яшчэ і па сёнешні дзень не займалася пытаннямі паспяховасці комсамольцаў, дысцыплінай, наведваннем лекцый і т. д.

Да ліку недахопаў адносіцца і слабая работа насценгазеты. Газета яшчэ не стала масавым арганізатарам. Так, выпушчаны днямі нумар змяшчае ўсяго толькі доўгі і нудны перадавы артыкул, адзін артыкул з факультэцкага жыцця і некалькі бледных, незразумелых рысункаў.

Нарэшце, значна затрымлівае работу адсутнасць на філфаку факультэцкага бюро КСМ.

**СТУДЭНТЫ.**

## ШТО ПАКАЗАЛІ ХІМІЧНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

Закончан першы этап VII Усесаюзных хімічных спаборніцтваў. У падрыхтоўцы гэтых спаборніцтваў вялікую работу правёў абаронны актыў універсітэта. Для лепшай арганізаванасці ўсе ўдзельнікі пахода VII хімічных спаборніцтваў былі разбіты на групы. Кожная група мела свайго камандзіра—актывіста Асоавіяхіма, які нёс поўную адказнасць за захоўванне ўдзельнікамі ўмоў спаборніцтва. Групы былі зведзены ў атрады, ахватваючыя сабой асобныя факультэты. Камандзіры атрадаў былі назначаны таксама з лепшых актывістаў універсітэта. У выніку добрай арганізаванасці і згуртаванасці груп, а галоўнае—разумення важнасці гэтага мерапрыемства паход 820 студэнтамі універсітэта быў зроблен выдатна.

Але нельга абыйсці маўчаннем і недахопы пры правядзенні спаборніцтваў. Замест 1500 чалавек, якія павінны былі прыняць удзел у спаборніцтвах, удзельнічала толькі 820 чалавек. Знайшліся таварышы, палічыўшыя зусім лішнім прыняць удзел у гэтым мерапрыемстве, праводзімым урадам і партыяй. Работніца бухгалтэрыі тав. Левіна заявіла, што «это просто игра, а я уже вышла с младенческого возраста». Дацэнт фізмата тав. Некрашэвіч завазіўся з дамашняй работай і не з'явіўся для ўдзелу ў паходзе. А студэнтка Кантаровіч перад паходам прадставіла наступную даведку ад свайго бацькі: «Дочь моя, Кантарович Сусанна, больна и ее состояние здоровья противопоказано длительному хождению и усиленным физическим мероприятиям.

Доктор Канторович».

Аналагічную даведку прадставіла і яе падруга тав. Рубніч Гінда. Трыццаць мінут работы ў процівагазе таксама неабышліся без здарэнняў. Многія студэнты беларускай групы 2 курса філфака па сігналу ХТ трымалі процівагазы на пагатове і надзелі іх толькі тады, калі адчыніліся дзверы праверачнай камісіяй. Даволі было толькі ёй выйсці, як процівагазы зноў былі зняты.

Амаль зусім былі сарваны спаборніцтвы сярод навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў, бо на паход з'явілася толькі 17 чалавек і то толькі пасля паўторнага абвяшчэння дня яўкі.

Трэба спадзявацца, што партыйны камітэт, комсамольская арганізацыя, мясцком і прафком універсітэта улічаць недахопы і зробяць адпаведныя вынікі з гэтых спаборніцтваў.

**А. ГЛАДКІ.**

# ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

Н. ГАМОЛКА

## ДВА ВЕРШЫ

### У ТОЙ ДЗЕНЬ

Бы сокам бярозы ўвесну,
Так радасці повен быў я.
Чаканыя словы, як веснік,
Гучэлі над светам з Крэмля.

Гучэлі... Дыханне стаіўшы,
Я рупар бліжэй падцягнуў.
Уяўляў: пагранічную цішу
Армейскія зоркі плывуць;

Выходзіць дзядок на дарогу,
Глядзіць з-пад рукі на сяло,
А гора на плечы старога
Каменнаю глыбай лягло.

Мой браце, не будзеш гаротным:
Рука твая ў братняй руцэ.
На землях салёных ад поту
Пасеў тваіх дум узрасце.

Вось рупар замоўк, ды ў песнях
Суровых не моўкла зямля.
Бы сокам бярозы ўвесну,
Так радасці повен быў я.

Мінск, 1939 год.

### СУХМЕНЬ

Гай. Ручэй пяе нясмела.
Радасць, дзе цябе сустрэць?
Лёг на твар мой загарэлы
Мяккі бархат ценю дрэў.

Ў сэрцы свежасць разлілася —
Вось дзе лёгка ўздыхну.
Апусціўшы лісце, ясень
Сніць па ўзгорку пра вясну.

Дрэмле ўсё, у спякоце ные,
Хоць бы конік зацвірчэў.
Уталіць смагу аж па шыю
Сонца ўлезла ў ручэй.

Ілья ЭЛЬКІНД

### СПЕЛАСЦЬ

Раніца на сонечным палоззі
Праплывае соннаю ракой.
Набракаюць промнямі калоссі,
Ловяць вецер жменяю рудой.

Ледзь крані і пырсне па калені
Спеласці гарачы сырадой.
...Быць-бы мне маленькім,
спелым зерпем
Між снапоў, накошаных табой.

Мінск, 1940 г.

Растислав Сазоник

## НАЙДЕННЫЕ ЦВЕТЫ

В необ'ятном небе птиц мелькают точки;
Тонут в летнем солнце, нивы и леса;
Лен расцвел, —
И в каждом лепестке-цветочке
Светится прозрачное небо-бирюза.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Подул резкий ветер холодом и знобью,
Шевельнул кудрями тонконогий лен,—
И цветы осыпал
на-земь
ветер злобный.
Лен качнулся тысячью
желтых веретен.
Нежными очами лен не смотрит боле,
Но увидел как-то,
поздним летом я:
с песней
Высыпала на льняное поле
Девушек-колхозниц дружная семья
Наклоняясь низко, что-то все искали
(Не цветы ль опавшие собирать
пришли?)
Быстрыми руками
Лен сухой таскали
Но цветков-улыбок,
Видно, не нашли.

Осень...
Снег посыпался
Дождевые,
постные
Лужи молоком, казалось, забелил,
Все дома окрестные
Оклеил берестой
И в сугробах
тайну лета схоронил.
А однажды,
дымчатым,
чудным зимним утром,
В интернат вошла к нам
девушка-краса:
Зубы отливают
чистым перламутром,
На плечах — косынка
словно бирюза.
Бирюза-косынка!
Вот они, цветочки.
(Значит их колхозницы отыскали
след)!
Принесла их девушка
в ситцевом платочке
И сказала, резвая:
— Воспевай, поэт!

Ілья Элькінд

## СЯРОЖА

У садку сягоння вее сумам,
Талы снег чарнее ля вугла.
Ён ідзе з паношанаю сумай —
Лістаносец нашага сяла.

Размывае сцежкі слота-восень,
Першы снег вядзе сялом зіму.
Трэці год лісты Сярожа носіць,
Трэці год зайздросціць аднаму.

Кожны дзень сябры яго, сяброўкі
Рады ліст чаканы атрымаць,
А Сярожу нават і паштоўкі
Дваццацікапеечнай
Няма.

Але вось прышла ў сяло навіна;
Хіба мог паверыць хто спярша,
Што нарком ў пісьме сваім
Гасцінна
У Маскву Сярожу запрашаў.

— Моў, табой акруга ганарыцца,
Ты ў нас вядомы паштавы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ад'яжджаў на свята ў сталіцу
Да наркома — сельскі кальцавы.

Мікола Лубан

## Мацi-Ператока

(Урывак)

Вясна ўвалілася раптоўна. Яшчэ зранку сляпіла вочы снежная бель, яшчэ ў яругах лісіных нор спакойна адсыпалася апошняя лютаўская завіруха, а ўжо к вечару ўсё ў перапалоху імкліва рынулася у Ператоку. Цэлую ноч па разорах агародаў, па вуліцы, па талых прыгуменках бурчэлі раўчукі.

Яшчэ не асеў як след ранішні туман, а кульгавы Ісай, белаканчанскі музыкант, палітык і незамянімы акушор — ужо прышоў падзівіцца, як за ноч раскідалася маці — Ператока.

—Бяры яе, хлопцы, у дручкі!—паказваючы на крыгу, камандаваў Ісай сабраўшымся паджыганцам. Хлапчукі з крыкам накідваліся на крыгу, і некалькімі ўдарамі расколвалі яе на дробныя кавалкі.

— Па-адлюга! — задаволена завяршаў Ісай.

Неўзабаве ўвесь канец сабраўся на мосціку. Хто азіраў гаспадарскім вокам залітыя сенажаці, хто дзівіўся напору вады і прыкідваў сам сабе, якое-б такое ўстройства паставіць, каб сабраць усю гэтую сілу. Ісай расказваў, як гады тры таму назад у Багулеўчыка прапаў гармонік.

Той год амаль кожнага вечару ў Белым канцы гулялі вечарынку, і вось аднаго разу, напіўшыся, гарманіст Багулевіч вяртаўся дадому. Мосцік знясло (як і штогод у Белым канцы), а слізкая кладка не адзержала п'янага Багулевіча, і ён паляцеў разам са сваім баянчыкам у раку.

Тры разы небарака кідаўся ў ваду, — прыхлушваў Ісай (на самай справе Саўка Багулевіч тады ледзь сам вырабіўся, а пра гармонік — і ў галаве не было).

Як там ні сталася, але тут Ісай не сцярпеў, каб не пахваліцца, яшчэ раз перад усімі, што ён некалі і сам «браў у рукі» гармонік, а цяпер непаладкі ў ім як рукою знімае.

Усе ведалі чаго варты словы Ісая, але нікога на гэты раз не знайшлося, каб памяшаць яму пазабаўляць людзей.

Тым часам вады прыбывала. У некаторых мясцінах вада пайшла па грэблі, размываючы пясок і ўносячы з сабою ламачча, якім штогод гацяць белаканчанцы грэблю. Ужо дзесятак дручкоў у руках вясёлых хлапчукоў нічога не маглі зрабіць з лёдам. Мора лёду рашуча насоўвалася на мосцік. Усе ўласна і чакалі таго моманту, калі пад націскам уздыбленых крыг мосцік разляціцца на шчэпкі. Пасля гэтага ўсе-б разышліся, пабралі-б свае чаўны і ўзахапы пайшлі-б лавіць плаваючыя паленні на дровы.

Мосцік летам нікому не патрэбен: перанесці ношку асакі, або схадзіць на дзерці лазы на лапці — досыць і жэрдкі перакінутай з берагу на бераг. Дый якая Ператока рака? Падаткнуўшы спадніцу жанчына летам па самай сярэдзіне з канца ў канец пярэйдзе. Праўда, калі белаканчанцам прыдзецца мурог вазіць з таго боку ракі, тут яны паахкаюць, тут, брат, без маста не абыйдзешся. Але гэта тыднёвая патрэба хутка забываецца. Вось чаму і цяпер нікога, уласна, лёс мосціка і не цікавіў, хутчэй гэта было проста прыемным відовішчам.

Крыгі пачалі падважваць падваліны мосціка, і ўсе паспяшаліся сыйсці на бераг. Ва ўточках падвалін мосцік выгнуўся гарбом уверх і пачаў хіліцца ў ход па цячэнню. Усе ўжо сабраліся былі выказаць сваё ўражанне, як раптам нечый голас пракрычаў:

— На мосце!.. На мосце!..

Усе вачыма кінулі на мост Сярод разварнутых ва ўсе бакі паленняў спакойна на карачках сядзеў хлапчук. Усе адразу пазналі глухога Сержыка, васьмігадовага хлапчука. Ён адной рукой трымаў пакінуты некім кій і накіроўваў яго на крыгу, а другою інстынктыўна абараняўся ад навісшага над галавою палена.

Натоўп анямеў. Нішто не магло выратаваць хлапчука. Усе бачылі, як Сержык раптам апамятаўся і ў перапалоху схваціўся за палена. Каварнае палена паднялося разам з усім ламаччам і пад гул натоўпа перакінулася ў ваду.

— Вяроўку!.. — закрычалі ў натоўпе.

Хлапец у расхлістаным кажушку ўскочыў на лёд, падцісвуў разбэрсаную абору лапця і, шыбнуўшы на нечыя рукі кажушок і шапку, пайшоў па крыгах.

— Мі-і-шка, куды ты?

Волелькі, божухна-ж мой, — загаласіла маці.

Нехта размахаў скручаны ў абаранак канец ужышча і шыбнуў на Мішку. Мішка латва злавіў яго і, абвязаўшыся за сярэдзіну, пайшоў далей.

— У ход бярыся, на чыстае, — крычаў з берагу Ісай.

## ТВОРЧАСЦЬ ПАЧЫНАЮЧЫХ

У мінулым годзе пры філалагічным факультэце нашага універсітэта арганізаваўся літаратурны гурток. За прайшоўшы час сіламі літгуртkоўцаў праведзены два літаратурныя вечары, адзін з якіх быў прысвечан памяці В. В. Маякоўскага, другі — творчасці паэтаў заходніх абласцей БССР. На гэтых вечарах зроблены даклады аб жыцці і творчасці В. В. Маякоўскага, аб гуманізме Маякоўскага, аб поглядах Маякоўскага на паэзію і інш. Пачынаючыя паэты выступалі з чыткай сваіх твораў. У красавіку мінулага года быў выпушчан першы нумар літаратурна-мастацкага журнала «Першыя крокі», у якім апрача перакладаў твораў Маякоўскага на беларускую мову і крытычных артыкулаў змешчаны вершы пачынаючых паэтаў.

Аднак, работу гуртка нельга лічыць дастатковай. Гурток працаваў несістэматычна, ад выпадка да выпадка.

Распрацаваная ў гэтым годзе праграма прадугледжвае арганізацыю творчых вечароў, выпуск літаратурна-мастацкага зборніка і журнала «Першыя крокі», а таксама папулярызацыю творчасці лепшых совецкіх паэтаў. Трэба толькі пажадаць, каб гэта праграма не асталася на паперы.

За апошні час гурток павялічыўся за лік здольных таварышоў — студэнтаў першага і другога курсаў філфака. Сярод іх патрэбна адзначыць здольнага пачынаючага паэта С. Абецэдарскага. Тав. Абецэдарскі з'яўляецца аўтарам больш дзесятка вершаў, сярод якіх маюцца сапраўды мастацкія творы. Яго верш «Над абрывам», напісаны некалькі год таму назад, перакладзен кампазітарам Палонскім на музыку. У ім хвалююча нарысаван вобраз юнага піонера, які ў суровых умовах фашысцкай Польшчы змагаўся за лепшае жыццё. Вершы Абецэдарскага друкаваліся ў газетах «Піонер Беларусі», «Чырвоная змена», а таксама ў раённым друку.

Сярод нешматлікіх таварышоў, працуючых у галіне крытыкі, патрэбна назваць Р. Сазоніка, які распрацоўвае вялікую тэму «Каўказ у ізабражэнні М. Ю. Лермантава». Працу над гэтай тэмай ён пачаў яшчэ ў мінулым годзе. Апрача крытыкі, Сазонік піша вершы на рускай і беларускай мовах.

Наглядаецца прыкметны творчы рост пачынаючага паэта Н. Гамолкі. За апошні час тав. Гамолка напісаў некалькі вершаў, вартых старонак друкаванага журнала. Настойліва працуючы над мастацкім вобразам, Гамолка дасягнуў некаторых поспехаў. Асабліва звяртае на сябе ўвагу яго апошні верш — псіхалагічна-алегарычная зарысоўка «Асіна», у якім мастацкі вобраз і ўдала скопленая дэталь знайшлі сваё адпаведнае месца. Верш хвалюе чытача, а гэта — неабходнейшая якасць кожнага мастацкага твора.

Аднак, патрэбна папярэдзіць Гамолку ад залішняга захаплення вобразамі. Надуманы, штучны вобраз (як у вершы «Касцы») зацямняе змест верша, зніжае яго мастацкія якасці. Як недахоп, патрэбна таксама адзначыць тэматычную абмежаванасць творчасці пачынаючага паэта. Пераважнае месца ў яго вершах займае прыродная лірыка, хоць, праўда, у апошні час, заўважаюцца спробы распрацоўкі тэм сучаснасці. Так, напрыклад, Гамолка напісаў невялікую паэму «Ладжо» пра вызваленне Заходняй Беларусі ад ярма польскіх эксплаататараў.

Далейшая вучоба Гамолкі павінна ісці па лініі яшчэ больш паглыбленай работы над вобразам, па лініі аўладання скарбніцамі багатай беларускай мовы.

Творчую работу Ілья Элькінд пачаў яшчэ на школьнай парце. Ад нясмелых спроб пяра на старонках дзіцячай газеты «Піонер Беларусі» да права друкавання на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» і журнала «Полымя рэвалюцыі», ляжыць шлях упартай і настойлівай работы над сабой. Тав. Элькінд валодае здольнасцю наглядальнасці, добра ведае беларускую мову. Вершы маладога паэта вызначаюцца лірычным пачуццём. Сярод твораў, напісаных Элькіндам, вершы пра вялікага Сталіна («Крэмль»), пра непераможную Чырвоную Армію («Першая радасць»), пра выдатных людзей нашай краіны («Сярожа») і інш.

І. Элькінд не абмяжоўваецца арыгінальнай творчасцю. Ён таксама пасляхова працуе над перакладам твораў В. В. Маякоўскага на беларускую мову. Перакладзены ім верш «Пасланне пролетарскім паэтам» быў змешчан у газеце «Літаратура і мастацтва».

Адзначаныя тут поспехі ў творчасці пачынаючых паэтаў — толькі першы крок для таго, каб стаць інжынерамі чалавечых душ. Далейшы творчы рост кожнага пачынаючага ў паасобку будзе залежыць ад таго, як ён здолее арганізаваць сваю работу. Адной здольнасці, аднога жадання мала для таго, каб стаць паэтам. Патрэбна заўсёды памятаць, што талент — гэта ў значнай ступені. стараннасць.

Г. ШКРАБ.

Літаратурную старонку падрыхтаваў студэнт II курса філалагічнага факультэта Гр. Шкраб.

Мінск, друкарня «Звязды» УК1624 Адказны рэдактар І. М. ЛЕВІН.